# Гомельскі ўніверсітэт

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 2 (789) | Аўторак, 15 студзеня 1991 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

*На Савеце рэктараў*

## АБ ТЫМ, ШТО ХВАЛЮЕ ВНУ

У мінулы чацвер адбылося першае ў новым 1991 годзе пасяджэнне Савета рэктараў. Яго адкрыў і вёў старшыня гэтага Савета рэктар Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны член-карэспандэнт АН БССР, прафесар Л. А. Шамяткоў.

На Савеце з каштоўнай прапановай выступіў загадчык кафедры радыяцыйнай фізікі Маскоўскага інжынерна-фізічнага інстытута (МІФІ) доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Я. А. Крамер-Агееў. Ён нагадаў, што ў МІФІ цяпер вядзецца падрыхтоўка кадраў па спецыяльнасці «Радыяцыйная бяспека чалавека і акалячага асяроддзя». Інстытут гатовы па мэтавых накіраваннях прымаць на вучобу абітурыентаў з Гомельшчыны, якія па атрыманні дыпломаў будуць накіроўвацца на працу ў сваю вобласць. Масквічы маюць магчымасць прымаць на стажыроўку спецыялістаў і выкладчыкаў па праблемах радыяцыі і аховы акаляючага асяроддзя, прыязджаць у гомельскія ВНУ для чытання цыкла лекцый па гэтай тэматыцы.

Прапанова МІФІ з удзячнасцю прынята.

У шырокую дыскусію вылілася абмеркаванне кадравай палітыкі ва ўмовах Гомельскага рэгіёна. Выступаючыя адзначылі, што пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС за прайшоўшыя гады з ВНУ вобласці пераехала ў іншыя гарады рэспублікі і краіны каля 1/3 выкладчыкаў, сярод якіх значная колькасць дактароў навук, прафесараў, кандыдатаў навук, дацэнтаў. Паніжэнне навуковага патэнцыялу вышэйшай школы не можа не трывожыць, бо ад яго ў значнай ступені залежыць якасць падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, што асабліва важна пры пераходзе на рыначныя адносіны.

Правамерна ставіліся пытанні і аб аплаце працы вузаўскіх работнікаў. У прыватнасці, сёлета яе павысілі на 50% педагогам школ. І гэта зусім правільна. Інакш і не можа быць пры хуткім падаражанні нашага жыцця. Але ж чаму пры павышэнні зарплаты з сістэмы народнай адукацыі выпала вышэйшая школа? Цяпер нават настаўнік пачатковых класаў атрымлівае заработную плату ў паўтара раза, а то і вышэйшую, чым асістэнт ВНУ, які па свайму ўзроўню ведаў па крайней меры прыраўноўваецца да настаўніка-метадыста.

Усе яшчэ на нізкім узроўні застаецца матэрыяльна-тэхнічная забяспечанасць нашых ВНУ. Не ствараюцца належныя ўмовы для плённай і творчай працы выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў. У гэтай сувязі зразумелая занепакоенасць рэктара нядаўна адкрытага Гомельскага медыцынскага інстытута прафесара Ю. І. Бандажэўскага. З боку тых органаў, ад каго гэта залежыць, вельмі мала робіцца для таго, каб новая, крайне неабходная для нашага рэгіёна медыцынская ВНУ як мага хутчэй, як кажуць, устала на ногі і паспяхова развівалася. Калі ў самы бліжэйшы час не зменіць адносін да яе, то нават тыя нямногія вучоныя і выкладчыкі, якія прыехалі сюды на працу, хутка развітаюцца з Гомелем.

Не пакінута без увагі і пытанне, як абараніць сацыяльныя інтарэсы студэнтаў пры маючым адбыцца павышэнні цэн на прадукты і тавары шырокага ўжытку.

На Савеце абмеркавана ўводзімае ў дзеянне новае Палажэнне аб Дзяржаўных экзаменацыйных камісіях, узгоднен пералік уступных экзаменаў у ВНУ ў 1991 годзе.

Па парадку дня Савета на яго пасяджэнні выступілі намеснік старшыні аблвыканкома А. М. Ярчак, Л. А. Шамяткоў, рэктар Гомельскага кааператыўнага інстытута М. П. Пісарэнка, рэктар Мазырскага педінстытута У. А. Дударэнка, прарэктары Гомельскага політэхнічнага інстытута С. Б. Сарэла і В. М. Кенько, іншыя члены Савета.

Заслухана інфармацыя рэдактара шматтыражнай газеты «Гомельскі універсітэт» У. П. Балогі аб выданні з 1991 года новай газеты «Вечерний Гомель», якая павінна стаць і трыбунай асвятлення жыцця ВНУ, іх здабыткаў і праблем. У гэтых мэтах прапанавана стварыць пры Савеце рэктараў прэс-цэнтр.

Было б карысна выкарыстоўваць і старонкі шматтыражкі «Гомельскі універсітэт» для сумесных спецыяльных выпускаў па студэнцкіх праблемах.

*Аб'яўлены конкурсы*

●

### ДА СКАРЫНАЎСКІХ НАВУКОВЫХ ЧЫТАННЯЎ

Загадам па універсітэту ад 7 студзеня 1991 г. аб'яўлены конкурс на лепшыя навукова-даследчыя работы, выкананыя ў ГДУ за папярэднія 2—3 гады. Мэта конкурсу — далейшае развіццё прыкладных і фундаментальных даследаванняў, больш поўнае выкарыстанне навуковага патэнцыялу для вырашэння навукова-тэхнічных і сацыяльна-эканамічных задач вобласці і рэспублікі. Конкурс будзе праводзіцца ў тры этапы і завершыцца традыцыйнымі Скарынаўскімі навуковымі чытаннямі. Першы этап конкурсу праводзіцца кафедрамі (лабараторыямі), другі — дэканатамі. Работы, прызнаныя лепшымі на першых двух этапах, прадстаўляюцца ў конкурсную камісію універсітэта не пазней 1 сакавіка 1991 года.

За даведкамі звяртацца па тэл.: 57-33-73, 57-76-99.

АД РЭДАКЦЫІ: спадзяемся, што як і ў мінулым годзе, для ўсіх жадаючых будзе прадастаўлена магчымасць азнаёміцца з работамі гэтага конкурсу і прыняць удзел у іх абмеркаванні на старонках нашай газеты. Думкі апанентаў дапамогуць аргкамітэту больш аб'ектыўна вызначыць пераможцаў.

□

### «АУКЦЫЁН ІДЭЙ»

Дзяржадукацыя СССР сумесна з Міжнароднай Асацыяцыяй «Інтэлектуальная ініцыятыва» прапануюць усім жадаючым прыняць удзел у адкрытым «Конкурсе ідэй». У конкурсе можа прыняць удзел кожны жадаючы, прапанаваць усё яшчэ нерэалізаваны патэнт або заяўку на вынаходніцтва, арыгінальную канструкцыю, тэхналогію, здольную да ўкаранення ў вытворчасць у хуткія тэрміны.

«Конкурс ідэй» дазволіць азначыць магчымыя формы ўзаемадзеяння арганізатараў прамысловасці з навучальнымі і навуковымі ўстановамі Дзяржадукацыі СССР, акажа рэальную дапамогу ўсім, хто пракладвае свой шлях ў навуцы, тэхніцы і адукацыі.

Арганізатары «Конкурсу ідэй» прапануюць, што ў 1991 годзе яго вынікі будуць праведзены ў красавіку—маі ў г. Маскве.

Арганізатары «Конкурсу ідэй» нагадваюць, што пачатак работы экспертаў залежыць толькі ад аўтараў. У «Конкурсе ідэй» спазніўшыхся не будзе. Працы, па якіх-небудзь прычынах не трапіўшыя на «Аукцыён ідэй» 1991 г., уключаюцца ў яго на наступны год.

Тэлефон для даведак 23-79-84 Дзяржадукацыі СССР. Кузякін Аляксандр Паўлавіч.

Тэл. для даведак ва універсітэце: 57-76-99.

*Ідзе зімовая сесія*

## З ФОТААПАРАТАМ НА ЭКЗАМЕН

Здаецца, толькі што сустракалі Новы год а ўжо сярэдзіна студзеня, які пакуль што зусім не падобны на зімовы месяц. А для студэнтаў ён нават гарачы. Адным — прыносіць радасць, другім — засмучэнні. Аднак мы не будзем унікаць ва ўсе акалічнасці ходу экзаменаў, аналізаваць іх вынікі. Сітуацыю ў некаторай ступені можна ацаніць і па гэтых фотаздымках.



Другакурснік фізічнага факультэта Дзяніс Ткачук добра падрыхтаваўся да экзамена па фізіцы і здаў яго дацэнту І. В. Семчанку на «выдатна».



«Цяжкі» білет.



Які ж выцягнуць лёгкі?

Фота У. Чысціка.

## УДАСТОЕНЫ ТРЭЦЯЙ ПРЭМІІ

Рэдкалегія «Настаўніцкай газеты» і Рэспубліканскі савет Педагагічнага таварыства БССР падвялі вынікі першага этапа конкурсу на лепшую публікацыю, прысвечаную праблемам педагагічнай творчасці. Трэцюю прэмію ў суме 150 руб. журы прысудзіла за матэрыял «Развіццё асобы і выхаванне», які змешчаны ў №№ 32—34 «Настаўніцкай газеты» за 1990 год. Аўтарам гэтай публікацыі з'яўляецца загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі нашага універсітэта, доктар педагагічных навук, прафесар, акадэмік АПН СССР Ф. І. Харламаў. Гэта падзея для Івана Фёдаравіча асабліва знамянальная. Споўнілася 30 гадоў, як ён супрацоўнічае з гэтым выданнем, якое стала добрым памочнікам педагогаў і выхавацеляў нашай рэспублікі. У яго яшчэ шмат задум адносна далейшага ўдасканалення народнай адукацыі, істотнага паляпшэння выхаваўчай работы з моладдзю. І мы ўправе чакаць яго новых цікавых і карысных публікацый.

# МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

У 1990 годзе працягвалася работа па падпісанаму пяцігадоваму дагавору аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве паміж кафедрай оптыкі нашага універсітэта і кафедрай хімічнай фізікі Карлава універсітэта (г. Прага). Навуковы кіраўнік — доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар А. М. Сердзюкоў, выканаўцы — кандыдаты фізіка-матэматычных навук, Г. С. Міцюрыч і І. В. Семчанка. У выніку сумесных даследаванняў распрацавана тэорыя фотаакустычнага эфекта хуткавыпаральных асяроддзяў у прысутнасці дадатковага да мадуліраванага няспыннага лазернага пучка. Разлічана амплітуда і фаза фотаакустычнага сігнала. Дадзена тлумачэнне працяканню фотахімічных працэсаў і рэакцыі на аснове распрацаванай тэорыі. Вынікі даследаванняў выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе — чытаецца спецкурс па фотаакустычнай спектраскапіі для студэнтаў 3 курса фізічнага факультэта па спецыялізацыі «Квантавая электроніка».

На выкладчыцкай рабоце за межамі нашай краіны знаходзяцца два чалавекі: кандыдат біялагічных навук дацэнт кафедры батанікі і фізіялогіі раслін А. В. Гаўрылаў — у Анголе, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры рускай літаратуры А. К. Няронская — у Камбоджы.

Вучонымі і супрацоўнікамі нашага універсітэта ў замежных часопісах апублікавана чатыры навуковыя артыкулы і столькі ж тэзісаў дакладаў. У выданнях міжнародных канферэнцый, якія праходзілі ў нашай краіне, апублікавана 8 тэзісаў дакладаў.

Летась у міжнародных канферэнцыях, у рабоце з'ездаў і сімпозіумаў удзельнічала 8 вучоных нашага універсітэта. Рэктар член-карэспандэнт АН БССР прафесар Л. А. Шамяткоў у саставе дэлегацыі Міністэрства народнай адукацыі БССР на працягу двух тыдняў знаходзіўся ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы. Камандзіроўка прадугледжвала мэту азнаямлення з дзейнасцю ВНУ Кітая. Дэлегацыя наведала вышэйшыя навучальныя ўстановы Пякіна, Цяньзіна, Сіаня. Былі выпрацаваны і падпісаны папярэднія пагадненні паміж ВНУ Беларусі і Кітая.

Прарэктар па вучэбнай рабоце дацэнт М. В. Селькін прыняў удзел у міжнародным матэматычным кангрэсе ў японскім горадзе Кіёта. На секцыі «Алгебра» ён выступіў з дакладам на тэму: «Некаторыя ўласцівасці канечных груп», тэзісы якога апублікаваны ў матэрыялах кангрэса. Ён сустрэўся з сусветна вядомымі вучонымі ў галіне матэматыкі Японіі, ФРГ, ЗША і інш. краін, азнаёміўся з арганізацыяй вучэбнага працэсу ва універсітэтах г. Кіёта. Атрыманыя ім на кангрэсе звесткі будуць прыменены ў распрацоўках навуковай дзяржбюджэтнай тэмы кафедры алгебры і геаметрыі.

Загадчык кафедры беларускай мовы прафесар У. В. Анічэнка ўдзельнічаў у міжнароднай канферэнцыі «500-годдзе з дня нараджэння Ф. Скарыны, беларускага друкара, вучонага і асветніка», якая праходзіла ў Варшаве. Тут ён выступіў з дакладам «Далёкія і блізкія галасы пра вялікага сына беларускага народа». На гэтай канферэнцыі была створана міжнародная асацыяцыя беларусаў, членам аргкамітэта якой выбралі і Уладзіміра Васільевіча.

Загадчык кафедры беларускай мовы прафесар У. В. Анічэнка ўдзельнічаў у міжнароднай канферэнцыі «500-годдзе з дня нараджэння Ф. Скарыны, беларускага друкара, вучонага і асветніка» якая праходзіла ў Варшаве. Тут ён выступіў з дакладам «Далёкія і блізкія» галасы пра вялікага сына беларускага народа». На гэтай канферэнцыі была створана міжнародная асацыяцыя беларусаў, членам аргкамітэта якой выбралі і Уладзіміра Васільевіча.

Загадчык кафедры дыфураўненняў дацэнт У. І. Міроненка летась таксама наведаў Польшчу. Ён удзельнічаў у рабоце трэцяга семінара, прысвечанага хістальным працэсам у сістэмах звычайных дыферэнцыяльных ураўненняў, якая праходзіла ў горадзе Познані. Тут Уладзімір Іванавіч выступіў з дакладам аб адлюстроўваючай функцыі дыферэнцыяльных сістэм, быў старшынёй на адным з пасяджэнняў семінара.

Дацэнт кафедры матэматычнага аналізу І. М. Бруй удзельнічаў у міжнароднай канферэнцыі па тэорыі прыбліжэнняў, якая праходзіла ў венгерскім горадзе Кечкамет, дзе таксама выступіў з навуковым дакладам.

Прарэктар па навуковай рабоце прафесар А. М. Сердзюкоў і начальнік НДС Г. С. Міцюрыч былі ўдзельнікамі міжнароднага сімпозіума па праблемах фізічнай акустыкі, які адбыўся ў г. Картрэйку (Бельгія). На сімпозіуме абмяркоўваліся праблемы фізічнай акустыкі і фотаакустычнай спектраскапіі, распаўсюджвання аднародных і неаднародных акустычных хваляў і інш. А. М. Сердзюкоў і Г. С. Міцюрыч выступілі з дакладам «Тэорыя фотаакустычнага эфекту ў лінейных і нелінейных гіратропных п'езаэлектрычных крышталях». У выніку ўдзелу нашых вучоных у рабоце гэтага сімпозіума атрымана інфармацыя аб сучасным стане фотаакустыкі, аб перспектыўным яе напрамку і праблемах, якія стаяць у гэтай галіне навукі.

Прафесар кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі Г. А. Кузняцоў прыняў удзел у V-м двухбаковым ГДР—СССР сімпозіуме па гісторыі і метадалогіі геалагічных навук, прысвечаным 325-годдзю Фрайбергскай горнай акадэміі і 120-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Тэзісы яго даклада апублікаваны ў матэрыялах сімпозіума.

Міжнароднае супрацоўніцтва вучоных нашага універсітэта ў мінулым годзе было, бадай, самым плённым. Ёсць упэўненасць што ў будучым яно ўзнімецца на новую вышыню і дасць яшчэ больш значныя вынікі.



# МАТЭМАТЫКА— ЯГО ПРЫЗВАННЕ

Многія дзеці ідуць шляхам сваіх бацькоў. Такое меркаванне можа скласціся, калі сказаць і пра Сашу Філіпцова. Як-ніяк яго бацька Уладзімір Фёдаравіч — кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт, доўгі час быў дэканам матэматычнага факультэта. Аднак Аляксандраў выбар прафесіі вызначыўся, як сцвярджае яго бацька, з самага дзяцінства. Ён па-сапраўднаму захапіўся матэматыкай, больш чым усім астатнім, з ранніх школьных гадоў. Неаднаразова ўдзельнічаў у матэматычных алімпіядах, быў у ліку пераможцаў і прызёраў.

Што датычыцца вучобы, дык да яе Аляксандр заўсёды адносіцца старанна, сур'ёзна. Сведчаннем таму — сярэбраны медаль, які ён атрымаў разам з атэстатам сталасці, па заканчэнні гомельскай СШ № 26.

На матэматычным факультэце Аляксандра ведаюць як аднаго з лепшых студэнтаў. Ён не толькі настойліва авалодвае выбранай спецыяльнасцю, але і не ўхіляецца ад грамадскай работы. Цяпер — стараста групы М-32, якая з'яўляецца адной з лепшых на курсе. Яго ведаюць, як добрага арганізатара, чулага і спагадлівага таварыша. Разам з тым, ён нічым не імкнецца вызначыцца сярод аднакурснікаў ці, як кажуць, узняцца над імі. Сціплы, памяркоўны. За гэтыя рысы, бадай, і больш за ўсе цэняць юнака.

Як надыходзіць лета, Саша не ўяўляе сябе без студэнцкага атрада. Ужо двойчы ён выязджаў у Цюменьскую вобласць, дзе працаваць нялёгка, але затое цікава.

**На здымку: ленінскі стыпендыят Аляксандр Філіпцоў.**

**Фота У. Чысціка.**

# СРОДКІ—НА НАВУКОВЫЯ РАСПРАЦОЎКІ

Адбылося пасяджэнне конкурснай камісіі па размеркаванню сродкаў, выдзяляемых з бюджэта рэспублікі і ФНТСР навукова-даследчага сектара на фарміраванне фундаментальных і пошукавых даследаванняў па прыярытэтных навуковых напрамках. Разгледжаны прадстаўленыя кафедрамі і лабараторыямі абгрунтаванні тэм, на аснове чаго конкурсная камісія пастанавіла — са сродкаў бюджэта рэспублікі (160 тыс. руб.) выдзеліць фінансаванне наступных тэм:

1. Распрацоўка золь-гель тэхналогіі атрымання аксідных матрыц і кампазітаў на іх аснове — 25 тыс. руб. (навуковы кіраўнік — дацэнт Мельнічэнка І. М.).

2. Стварэнне метадаў і сродкаў выпрабавання і кантролю матэрыялаў і вырабаў — 20 тыс. руб. (навуковы кіраўнік — дацэнт Мельнічэнка І. М.).

3. Распрацоўка сістэмы аўтаматызацыі мадэлявання інтэлектуальных сістэм (САМІС)— 10 тыс. руб. (навуковы кіраўнік — прафесар Максімей І. В.).

4. Радыкальныя і прымітыўна замкнутыя класы — 30 тыс. руб. (навуковы кіраўнік— член-кар. АН БССР, прафесар Шамяткоў Л. А.).

5. Электрадынаміка і акустыка крышталяў на вонкавых палях — 20 тыс. руб. (навуковы кіраўнік — прафесар Сердзюкоў А. М.).

6. Іёнаметрычныя даследаванні слюны пры дазіраванай фізічнай нагрузцы — 10 тыс. руб. (навуковы кіраўнік — прафесар Кіеня А. І.).

7. Даследаванні рэакцый узаемадзеяння структурных часцінак з мэтай выяўлення фізічных заканамернасцей кварц-глюоннай дынамікі пры высокіх энергіях — 15 тыс. руб. (навуковы кіраўнік — дацэнт Максіменка М. В.).

8. Традыцыйная духоўная культура і рэгіянальныя асаблівасці Усходняга Палесся— 10 тыс. руб. (навуковы кіраўнік — прафесар Анічэнка У. В.).

9. Чарнобыль і духоўная спадчына беларусаў — 10 тыс. руб. (навуковы кіраўнік — дацэнт Штэйнер І. Ф.).

**Са сродкаў ФНТСР НДС (110 тыс. руб.) выдзеліць фінансаванне для наступных тэм:**

1. Рэчавы састаў і генетычная прырода верхняй мантыі. Рэдкія землі ў крышталічным фундаменце Беларусі — 10 тыс. руб. (навуковы кіраўнік — прафесар Вахрушаў В. А.).

2. Фізічнае і матэматычнае мадэляванне АФУ і вымяральных стэндаў — 10 тыс. руб. (навуковы кіраўнік — дацэнт Дабравольскі І. Ф.).

3. Даследаванне матэматычных структур і мадэляў, апісваючых рэальныя працэсы ў простых асяроддзях, інфармацыйна-вылічальных сістэм і сетках сувязі — 10 тыс. руб. (навуковы кіраўнік — прафесар Шаймуратаў Р. В.).

4. Фотатэрмаакустычная тэрмаскапія гіратропных асяроддзяў — 15 тыс. руб. (навуковы кіраўнік — дацэнт Аляшкевіч М. І.).

6. Даследаванні ўплыву аварыі на Чарнобыльскай АЭС на сацыяльна-дэмаграфічнае развіццё рэгіёна — 10 тыс. руб. (навуковы кіраўнік — прафесар Арэшчанка У. Д.).

7. Вывучэнне фізіялагічных механізмаў стамлення пры інтэлектуальнай, фізічнай і спартыўнай дзейнасці— 7,0 тыс. руб. (навуковы кіраўнік — д. м. н. Дзядзічкін В. П.).

8. Вывучэнне разумовай і фізічнай працаздольнасці навучэнцаў 5—8 класаў агульнаадукацыйных школ пры навучанні з 6-гадовага ўзросту — 8 тыс. руб. (навуковы кіраўнік — дацэнт Зайцаў Б. М.).

9. Тэарэтычнае і эксперыментальнае даследаванне лазернага напаўнення металічных і дыэлектрычных пакрыццяў на крышталёвыя падложкі — 25 тыс. руб. (навуковы кіраўнік — с. н. с. Малашчанка А. Ц.).

# ВЫБРАНЫ НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

Як паведамлялася ў нашай газеце, 3 студзеня адбылося пасяджэнне Вучонага савета універсітэта, на якім па конкурсу на вакантныя пасады выбраны:

**Баннікава Людміла Сцяпанаўна** — загадчыцай кафедры англійскай мовы.

**Іванюк Аляксей Іванавіч** — загадчыкам кафедры аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі.

**Гуліцкая Вольга Аляксееўна, Еўтухоў Уладзімір Дзмітрыевіч** — дацэнтамі кафедры беларускай мовы.

**Кашпай Валерый Мікалаевіч** — дацэнтам кафедры тэарэтычнай фізікі.

**Казакоў Мікалай Паўлавіч** — дацэнтам кафедры фізічнай метралогіі.

**Пінчук Вячаслаў Рыгоравіч Семчанка Ігар Валянцінавіч** — дацэнтамі кафедры агульнай фізікі.

**Жогла Васіль Гаўрылавіч** — дацэнтам кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі.

**Гараніна Тамара Пятроўна** — дацэнтам кафедры этыкі, эстэтыкі і гісторыі культуры.

**Гладышаў Уладзімір Сцяпанавіч** — дацэнтам кафедры гісторыі СССР і БССР.

**Купрэеў Міхаіл Пятровіч** — ст. выкладчыкам кафедры агульнай фізікі.

Па выніках выбараў да вучонага звання дацэнт рэкамендаваны кандыдат эканамічных навук **Андрэева Наталля Васільеўна** з кафедры эканамічнай інфарматыкі і аўтаматызаваных сістэм кіравання і кандыдат біялагічных навук **Маркелава Рыта Іванаўна** з кафедры батанікі і фізіялогіі раслін.

